# НавінЫ

БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

СПЭЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

кастрычнік 2000 г.


# БАЙКОТ АДБЫЎСЯ. ПУКАШЭНКА ПРАЙГРАЎ.




***Раніцай 15 кастрычніка на выбарчым участку Лукашэнка ўпэўнена заявіў, што на ягоныя выбары ў палату прыйдзе 70% беларусаў.***

Беларусы, аднак, аказаліся мудрэйшымі. Вечарам спалоханы твар рэзанаснага Зімоўскага ды няўпэўнены голас Ярмошынай сьведчылі, што нешта здарылася. Стала зразумела, што выбары, якія так рэклямаваў і прасоўваў рэжым, праваліліся.

Нягледзячы на запалохваньні, ды ашалелую прапаганду, большасьць народу на выбары не пайшла. Выбары не адбыліся ні ў Менску, ні ў буйных гарадах. Гэта была нечаканая параза Лукашэнкі й ягонай сыстэмы. Замест абяцаных 70% на выбарчыя ўчасткі па ўсёй Беларусі прыйшло усяго толькі каля 45%, а ў гарадах - і таго менш. Паводле зьвестак назіральнікаў, "выбары" не адбыліся як мінімум у 41 акрузе (для таго, каб кампанія "Байкот - 2000" прайшла з посьпехам, было дастаткова 37 акругаў).

Улады выкарыстоўвалі ўсё, што маглі: буйныя фальсыфікацыі ды падтасоўкі. Яны спрабавалі зрабіць адзін вялікі падман народу. Але ім урэшце ніхто не паверыў. Ніхто ня даў веры, што выбары адбыліся. Зразумела, што Захад не прызнаў іхныя вынікі. Але для Лукашэнкі ня гэта было самым страшным. Страшна тое, што правал выбараў стаў першым званком для ўсіх, на кім ён сам трымаўся, асабліва для вэртыкальшчыкаў, войска ды чыноўнікаў. Яны ўбачылі, што рэжым хістаецца, і пачалі думаць, ці варта яго падтрымліваць, каб ня рухнуць потым разам зь ім. Калі што, яны за яго стаяць ня будуць – здадуць, як калісьці Кебіча.

Як ні стараўся Лукашэнка, яму нікога не ўдалося падмануць, нават сябе. Кампанія "Байкот – 2000" стала першым і пасьпяховым крокам да выбараў новага Прэзыдэнта Беларусі ў 2001 годзе.

vytoki.net

# Выбары ў палату не адбыліся, як мінімум, у 41 акрузе

## Паводле зьвестак прэсавай групы БНФ на 16 кастрычніка

*Байкот адбыўся. У Менску гэта было найбольш відавочна: на лукашэнкаўскія выбары тут пайшло крыху больш за 30%. У большыні вялікіх гарадоў рэжым таксама праваліў выбары. Ноччу ўлада ў паніцы спрабавала фальсыфікаваць іхныя вынікі. Дапамог рэжыму і працэнт папярэдняга галасаваньня, якое, безумоўна, ёсьць суцэльным злачынствам.*

*Тым ня менш, галоўны вынік Байкоту – 2000: ніякім праўным чынам палата сфармаваная быць ня можа.*

### ГОМЕЛЬ

Зноў жа, афіцыйная інфармацыя не супадае са зьвесткамі незалежных назіральнікаў. Як сьцьвярджаюць назіральнікі, выбары не адбыліся ў акругах № 33 і 35. Датэрмінова ў Гомлі прагаласавала 13%. У Гомельскім раёне – 17%. У Буда-Кашалёве, паводле зьвестак камісіяў, датэрмінова прагаласавала ажно 23% выбарнікаў.




Галасаваньне на парлямэнцкіх выбарах. На месцы старшыні ўчастковай камісіі сядзіць дзяўчына – афіцэр міліцыі.

### ВІЦЕБСК

Ва ўсім Віцебску (4 акругі) выбары не адбыліся. Гэты факт прызналі ўлады.

17 акруга г.Віцебска: прагаласавала 39,68% (зьвесткі незалежных назіральнікаў). 44,8% – афіцыйныя зьвесткі. Кастрычніцкая акруга: 38,75% (зьвесткі назіральнікаў), 41,78% (афіцыйныя).

Датэрмінова прагаласавала 9%-12% насельніцтва.

Паводле зьвестак выбары не адбыліся таксама ў наступных гарадах: *МАЛАДЭЧНА – 1* акруга, *БАРЫСАЎ – 1, САЛІГОРСК – 1, МАЗЫР – 1, ЖОДЗІНА – 1* (яўка каля 42%), *НАВАПОЛАЦАК – 1, ЗАСЛАЎЕ – 1* (яўка каля 35%), *БАБРУЙСК – 1, БАРАНАВІЧЫ – 1* і *СЬВЕТЛАГОРСК – 1.*

Усяго, паводле зьвестак аб'яднанай апазыцыі, у «выбарах» удзельнічала толькі 45% выбарнікаў.

**Аляксей ШЭІН**



### МЕНСК

Паводле зьвестак назіральнікаў, ва ўсіх 18 акругах сталіцы выбары былі прабайкатаваныя. У сваю чаргу, ЦВК сьцьвярджае, што толькі ў 3 акругах выбары не адбыліся.

### БЕРАСЬЦЕ

Выбары не адбыліся ў 4 акругах. Правал выбараў у горадзе афіцыйна прызнаў Цэнтарвыбаркам. Датэрмінова прагаласавалі каля 10% насельніцтва.

### МАГІЛЁЎ

Улады кажуць, нібыта ў Магілёве выбары прайшлі.

Але назіральнікі сьцьвярджаюць, што ўва ўсіх трох акругах гораду быў байкот: галасаваць прыйшло ня больш на 45%



vytoki.net

# Асноўныя тэндэнцыі парушэньня заканадаўства на выбарах 15 кастрычніка.

***Выбары 15 кастрычніка ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прайшлі са значнымі парушэньнямі выбарчага заканадаўства.***

Праваабарончы цэнтар "Вясна" вылучыў 180 назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі ў Менску і іншых гарадах Беларусі. Назіральнікі зафіксавалі факты парушэньняў выбарчага заканадаўства. Па фактах парушэньняў назіральнікі склалі акты.

Праз тыповыя факты парушэньняў Выбарчага кодэксу, зафіксаваныя назіральнікамі, можна прасачыць асноўныя тэндэнцыі парушэньняў выбарчага заканадаўства, характэрныя для выбараў 15 кастрычніка.



***Падчас акцыі «Байкот – 2000» адбыўся суд над рэдактарам газэты «Рабочы» Віктарам Івашкевічам. Яго абвінавачвалі ў закліку байкатаваць выбары, хаця Закон аб выбарах байкот дазваляе. Улады канфіскавалі частку накладу газэты.***

**1. Зьніжэньне колькасьці зарэгістраваных выбарнікаў (пачалося ў абед).**

На ўчастку 251 (Пайднёва-заходняя выбарчая акруга) – на 8 раніцы было зарэгістравана 2985 чалавек, а перад падлікам галасоў стала 2920). На ўчастку 501 зранку было 2236, перад падлікам галасоў – 1813). Людзей выкрэсьлівалі са сьпісаў цэлымі сотнямі для таго, каб падвысіўся працэнт яўкі.

**2. Хаджэньне сяброў камісіі па кватэрах з выбарчымі скрынямі.**

На 100-ым менскім выбарчым участку члены камісіі хадзілі па кватэрах і агітавалі ісьці на выбарчыя ўчасткі. На 195-ым участку старшыня камісіі В.Клышэўскі прызнаў, што людзі не прасілі прыходзіць да іх; многія, да якіх прыходзілі са скрынямі ўжо прагаласавалі, але не былі выкрэсьленыя з агульнага сьпісу.

ПЦ "Вясна" таксама стала вядома, што ў Менску на вуліцы Асаналіева, у раёне Шабаны, вуліцы Кнорына члены камісіяў хадзілі па кватэрах з выбарчымі вурнамі і прапаноўвалі галасаваць у хаце. Між тым, у Выбарчым кодэксе сказана, што галасаваньне па "месцы знаходжаньня асобы" можа адбывацца выключна на "просьбу выбарнікаў, выказанай у вуснай ці пісьмовай форме". Але ж людзі з урнамі прыходзілі да тых, хто не выказваў жаданьня галасаваць і не падаваў заявак ні ў вуснай, ні ў пісьмовай форме.

**3. Галасаваньне па студэнцкіх білетах і заліковых кніжках.**

У першай палове дня з 497-га менскага выбарчага ўчастку, Каліноўскай акругі ад н[illegible] "Вясна" Станіслава Карашчанкі паступіў сыгнал, што студэнты галасуюць па студэнцкіх білетах (у той час як арт. 52 Выбарчага кодэксу гаворыць, што бюлетэнь для галасаваньня выдаецца "пасьля прад'яўленьня пашпарту альбо замяняючага яго пасьведчаньня асобы"). У Выбарчым кодэксе не агаворана, ці зьяўляецца такім пасьведчаньнем студэнцкі білет (там не адзначанае грамадзянства й месца прапіскі). Юрыст ПЦ "Вясна" Валянцін Стэфановіч патэлефанаваў у Цэнтральную выбарчую камісію, дзе першапачаткова сказалі, што па студэнцкім білеце галасаваць нельга, бо там не адзначанае грамадзянства. Але на 497 выбарчым участку працягвалі настойваць на тым, што з Цэнтральнай выбарчай камісіі прыйшло вуснае распараджэньне - дазволіць галасаваньне па студэнцкіх білетах. В. Стэфановіч патэлефанаваў яшчэ раз у ЦВК, трубку ўзяў Яўген Аўдзееў, які адназначна заявіў: "Па студэнцкім білеце галасаваць дазволена, можаце на мяне спасылацца". Такім чынам з ЦВК былі атрыманыя два супрацьлеглыя адказы, і для ўдакладненьня пытаньня давялося тэлефанаваць намесьніку старшыні ЦВК сп. І. Ліхачу. Сп. Ліхач сказаў, што 14 кастрычніка зьбіралася паседжаньне ЦВК і "На шматлікія просьбы кіраўніцтва навучальных установаў", вырашылі дазволіць галасаваньне па студэнцкіх білетах. Варта адзначыць, што ў канцы дня на ўчастку 497 галасавалі ня толькі па студэнцкіх білетах, але і па заліковых кніжках.

**4. Псыхалягічны ціск на выбарнікаў у дзень галасаваньня.**

На 529 выбарчым участку ў Менску выхавальнік інтэрнату В. Маскалёва агітавала да ўдзелу ў выбарах. На пытаньне назіральніка: «Чаму вы гэта робіце?» адказала: «А што мне рабіць, калі загадала начальства?». Гэты факт сьведчыць пра ціск, які на розных роўнях аказвалі ўлады на грамадзянаў у дзень выбараў.

Заніманец Аляксандар Міхайлавіч, які праходзіць лячэньне ў Навуковадасьледчым інстытуце тубэркулёзу, паведаміў, што яго папярэдзілі: калі ён ня пойдзе галасаваць у нядзелю, то ў панядзелак яго гвалтам выпішуць з бальніцы.

**5. Зьнішчэньне (без падліку) нявыкарыстаных бюлетэняў.**

На 195-ым менскім участку, Ясенінская акруга (старшыня Веналій Клышэўскі), пры падліку галасоў усе нявыкарыстаныя бюлетэні былі парваныя і выкінутыя без падліку. Колькасьць нявыкарыстаных бюлетэняў цяпер немагчыма падлічыць. Гэтыя дзеяньні даюць шырокія мажлівасьці для фальсыфікацыі вынікаў, бо ў такім выпадку невядома, колькі людзей прагаласавала . Гэтым было груба парушанае патрабаваньне Арт. 55 Выбарчага кодэксу РБ,

*працяг на стар. 4*

vytoki.net

## Зварот Сойму БНФ "Адраджэньне" Да беларускага народу й міжнароднай супольнасьці

15 кастрычніка 2000 году апошні дыктатар Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы зрабіў спробу ўзаконіць вынікі дзяржаўнага перавароту 1996 году праз выбары ў г.зв. "палату прадстаўнікоў". БНФ "Адраджэньне" разам з усімі арганізацыямі, што ўваходзяць у Каардынацыйную раду дэмакратычных сілаў, заклікаў людзей да байкоту выбарчага фарсу. У выніку беларускі народ падтрымаў нас, масава не прыйшоўшы на псэўдавыбары, а прамаскоўскі рэжым пацярпеў сакрушальную паразу. Нягледзячы на пагрозы, прымус і прапагандовую хлусьню, рэальная яўка на г.зв."выбары" па краіне склала менш за 45%, а ў гарадах каля 30%. Гэтага факту ўлады не змаглі схаваць нават шляхам шырокамаштабных адкрытых фальсыфікацыяў. Кампанія "Байкот-2000" закончылася нашай агульнай перамогай.

Належыць вялікая падзяка ўсім, хто мужна данесіў да людзей слова праўды праз улёткі, пікеты, ладжаньне масавых акцыяў у гарадох краіны. Засьведчылі грамадзянскую адказнасьць усе грамадзяне, што не паддаліся на ўціск і пагрозы ўладаў ды не пайшлі на выбарчы спэктакль. Асобнае слова павагі адрасуем тым сябрам выбарчых камісіяў, што не збаяліся ціску й магчымых рэпрэсіяў ды не пагадзіліся фальсыфікаваць вынікі "выбараў". Вялікую ролю адыграла тая незалежная прэса, што не падыгрывала рэжыму, а аб'ектыўна інфармавала чытачоў пра кампанію "Байкот-2000". У Беларусі пачынае фармавацца дзеяздольная дэмакратычная грамадзянская супольнасьць.

Наступае пара падрыхтоўкі да 2001 году -- паваротнага ў найноўшай беларускай гісторыі, калі дзеля ўратаваньня незалежнасьці Бацькаўшчыны дыктатура мусіць сысьці: шляхам прэзыдэнцкіх выбараў альбо іншым чынам. Мы запрашаем да кааліцыйнай супрацы ўсіх незалежнікаў і дэмакратаў, у тым ліку й тых, хто паспрабаваў удзельнічаць у фарсе, але атрымаў заканамерную й плянаваную рэжымам паразу. Але палітыкі, якія ўпарцяцца ў імкненьні легітымізаваць "палатку" сваім удзелам у бясконцых, як цяпер відаць, давыбарах у яе, не зьяўляюцца нашымі саюзьнікамі й ня могуць разглядацца як удзельнікі дэмакратычнай кааліцыі.

Мы выказваем слова ўхвалы міжнароднай супольнасьці, урадам эўрапейскіх краін, ЗША й Канады, міжнародным арганізацыям, якія не прызналі фарсу 15 кастрычніка за свабодныя й справядлівыя выбары. Тым самым міжнародная дэмакратычная супольнасьць дала нам, беларускай дэмакратычнай апазыцыі, шанец не дапусьціць легітымізацыі рэжыму й пераняць палітычную ініцыятыву. Заклікаем усіх, каму дарагія ідэалы дэмакратыі ды хто разважліва думае пра стабільнасьць у Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе, працягваць ізаляцыю рэжыму Лукашэнкі, прызнаваць толькі легітымны Вярхоўны Савет і не надаваць ніякага міжнароднага прызнаньня незаконна заключаным ад імя беларускага народу саюзным пагадненьням з Расеяй.

**21 кастрычніка 2000**

# «Лукашэнка выбары праваліў»



**Алесь БЯЛЯЦКІ**

Я ацэньваю байкот як абсалютна ўдалую акцыю. Скажу шчыра, што я асабіста бачыў дзьве задачы ўсёй кампаніі. Першае – дабіцца непрызнаньня "выбараў" дэмакратычнымі - гэта задача мінімум. А задача максымум - каб вынікам гэтай кампаніі быў рэальны байкот, які ў рэшце ў нас атрымаўся. Зь дзьвюх задач мы выканалі дзьве. Гэта вельмі добры задзел на наступны год.

Іншая справа, што выбарчыя камісіі і Цэнтарвыбаркам палічылі гэтыя бюлетэні так як яны хацелі, але пры сёньняшняй сытуацыі, якая склалася і ў участковых, і ў акруговых камісіях, і ў Цэнтарвыбаркаме, чакаць чаго-небудзь іншага проста не выпадала.

Нашая задача зараз – давесьці кампанію "Байкот - 2000" да канца і паказаць людзям, што ўсё ж такі адбылося насамрэч.

Хваля вялікага незадавальненьня працягваецца да гэтага часу, бо шмат людзей было выгнана гвалтам на "выбары". І пэўна, што ўлады вельмі моцна прайгралі ў гэтым пытаньні. Мы мусім паказаць зараз людзям, што большая частка не хадзіла на гэтыя выбары. Каб хваля хлусьні, што ліецца зараз з БТ, не падманула людзей.

Мы павіны выкарыстаць набыты досьвед, каб у наступным годзе спрацаваць яшчэ больш прафэсійна.



**Вінцук ВЯЧОРКА**

Кампанія байкоту, зладжаная Беларускім Народным Фронтам і іншымі дэмакратычнымі партыямі, адбылася. І нават лепей, чым можна было спадзявацца. Рэальная яўка па гарадох - 30 зь нечым працэнтаў, а у сярэднім па Беларусі -менш за 45 працэнтаў. У гэтай лічбе сыходзяцца ўсе: незалежныя назіральнікі, партыйныя актывісты, аналітыкі.

Лукашэнка прайграў. І неістотна, што ягоныя памагатыя "намалявалі" дадатковыя працэнты яўкі. Яны не змаглі нават "дамаляваць" свае лічбы да 70%, чаго патрабаваў Лукашэнка. Усе пабачылі, што ўжо няма ў яго адміністрацыйнага рэсурсу трымаць краіну пад кантролем: і чыноўнікі, і сілавікі, і заходнікі, і Расея.

Беларусь – апошняя краіна ў Эўропе, якая мае дыктатара. У наступным годзе рэальна дамагчыся, каб дыктатарская ўлада ў Беларусі была адхіленая.

*Пачатак на стар.3*

## Асноўныя тэндэнцыі парушэньня заканадаўства на выбарах 15 кастрычніка.

які гаворыць: "Перад ускрыцьцём скрыняў для галасаваньня ўсе невыкарыстаныя бюлетэні падлічваюцца і пагашаюцца, складаюцца ў пакункі і апячатваюцца выбарчай камісіяй. На пакунках надпісваюцца назва і нумар участку, колькасьць нявыкарыстаных бюлетэняў".

**6. Удзел супрацоўнікаў выканкаму ў падліку галасоў.**

П'яных Сяргей: "15 кастрычніка 2000 г. я назіраў за выбарамі дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў РБ ў Каліноўскай акрузе, Старшыня камісіі А. Валевіч. На паседжаньне акружной камісіі мяне дапусьцілі ў 23.00. За час маёй прысутнасьці на паседжаньні, старшыні ўчастковых камісій, у якіх знаходзіліся якія-небудзь заўвагі па пратаколах галасаваньня, перапісвалі пратаколы, не выходзячы з будынку выканкаму (на працягу 15-20 хвілін). Гэта былі 512 і 497 участкі і некаторыя іншыя. У 23.30 на паседажаньне прыйшла Л.Старасьціна (супрацоўнік выканкаму) і давала парады па выпраўленьню памылак у пратаколах. Яна таксама запрасіла супрацоўнікаў выканкаму прыняць удзел у падліку галасоў. У 23.30 на паседжаньне прыйшлі два супрацоўнікі выканкаму і сталі падводзіць падлікі галасоў, беручы пратаколы ў старшыняў участковых камісіяў. Мною быў папярэджаны старшыня камісіі Валевіч, які адказаў, што гэта тэхнічныя супрацоўнікі камісіі, але прозьвішчаў іх ён ня ведае. Праз паўгадзіны гэтыя супрацоўнікі выканкаму перайшлі ў іншы кабінет і член камісіі Н. Анасава стала скіроўваць старшыняў участковых камісіяў да іх. Камісію 526 ўчастку пры мне скіравалі "перабіваць" вынікі выбараў ў кабінет да Л. Старасьцінай".

**7. Псыхалягічны ціск на студэнтаў падчас папярэдняга галасаваньня.**

Студэнтка Менскага ўнівэрсытэту культуры: "13-га кастрычніка на лекцыю прыйшла намесьніца дэкана Дуркіна Галіна і сказала: "Хто не прагаласаваў, хай не скардзяцца, што ў іх будуць праблемы. Яна папрасіла ўстаць тых, хто жыве ў інтэрнаце і не прагаласаваў учора. Такіх было два чалавекі, яны разам з намесьніцай дэкана пайшлі на ўчастак 176 на папярэдняе галасаваньне".

**Інфармацыйны аддзел ПЦ "Вясна"**


vytoki.net

# ФАРС у Менску

***Расейскі прэзыдэнт Уладзімер Пуцін патэлефанаваў свайму суседу ў Беларусі, каб павіншаваць яго з правядзеньнем свабодных і дэмакратычных прэзыдэнцкіх выбараў - так паведамілі ў Адміністрацыі прэзыдэнта ў Менску.***

Але паводле зьвестак АБСЭ, арганізацыі, якая даслала каманду тэхнічных наглядальнікаў, "не было забясьпечана самых мінімальных патрабаваньняў для правядзеньня свабодных, чэсных, справядлівых і адкрытых выбараў".

Ніякія ўхвалы ці крытыка ня здольныя зьмяніць вынікі выбараў у Беларусі. Асноўныя апазыцыйныя партыі байкаталі выбары, але ж згодна дадзеным выбарчай камісіі, яўка склала больш за 50%, неабходных для таго, каб лічыць, што выбары адбыліся.



*Лукашэнка даказваў, што ў яго ўсё атрымалася...*

Адрознай рысай кіраваньня сп. Лукашэнкі зьяўляецца незвычайная мяшанка старога камуністычнага мысьленьня, асаблівасьцяў ягонага характару і карупцыі. Пасьля падзеньня Слабадана Мілошавіча ў Югаславіі, ён застаўся апошнім рэальным дыктатарам у Эўропе, які дэманструе абсалютную абыякавасьць да абвінавачваньняў у фальсыфікацыі вынікаў выбараў.

Можна вельмі проста ігнараваць парушэньне правоў чалавека і карыкатурную аўтакратыю ў Беларусі, дзе ля 10 мільёнаў чалавек жыве ў спрэчнай незалежнасьці ад суседняй Расеі. Беларусь знаходзіцца паміж НАТО (мяжа з Польшчай) і Расеяй, і яе нестабільнасьць можа нэгатыўна сказацца на стане справаў у Прыбалтыйскіх краінах, як і ў суседніх зь ёй рэгіёнах Расеі.

Што тычыцца адносінаў з Захадам, Лукашэнка заўсёды ўзводзіў сьцяну паміж Беларусьсю і краінамі Заходняй Эўропы. Ён разглядае такія міжнародныя ўстановы як Міжнародны валютны фонд "падманшчыкамі" і цалкам адмаўляе любыя рэформы, скіраваныя на ўвядзеньне рынкавай эканомікі. Ён прапаноўваў палітычнае прыстанішча Слабадану Мілошавічу, але сэрбскі лідэр пакуль ніяк не рэагуе.

Цалкам верагодна, што суайчыньнікі Лукашэнкі - самыя сапраўдныя няўдачнікі. Яны, канешне, могуць павыхваляцца разьвітой індустрыяльнай базай і наяўнасьцю кваліфікаванай працоўнай сілы. Але прыгожыя пэрспэктывы разьвіцьця эканомікі былі перакрэсьленыя эксцэнтрычнай палітыкай прэзыдэнта, уключаючы двайны стандарт у сыстэме абменнага курса валютаў, які да зваляе ствараць умовы для партнэраў у бізнэсе і пакараць звычайных спажыўцоў.

Але ж менавіта сп. Пуцін павінен адчуваць занепакоенасьць. Лукашэнка зьяўляецца жывым прыкладам найгоршых камуністычных часоў зь некаторымі ўласьцівымі толькі яму асаблівасьцямі. Ён імкнецца да інтэграцыі з Расеяй, верагодна таму, што спадзяецца стаць у адзін дзень гаспадаром Крамля.

Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што Пуцін запаволіў курс на аб'яднаньне зь Беларусьсю.



*...Але павіншавалі яго зь перамогай толькі з Расеі*




## Выбары ў Беларусі – несапраўдныя

***16 кастрычніка ЗША заявілі, што ня будуць прызнаваць вынікаў парлямэнцкіх выбараў у Беларусі, цытуючы такія факты як прэсынг ураду Аляксандра Лукашэнкі на сродкі масавай інфармацыі і перасьлед кандыдатаў ад апазыцыі.***

Рашэньне ЗША можа стварыць напружанасьць у адносінах паміж ЗША і Расеяй, якая падпісала саюзную дамову зь Беларусьсю.

Паводле словаў прадстаўніка Дзярждэпартамэнту, "у цяперашніх умовах у Беларусі немагчымае правядзеньне сапраўдных свабодных і справядлівых выбараў".

Было ўказана на шэраг антыдэмакратычных крокаў беларускага ўраду, у прыватнасьці – закрыцьцё незалежных газэтаў.

Беларуская апазыцыя абвінаваціла ўрад у завышэньні колькасьці тых, хто хадзіў галасаваць.

Але расейскія наглядальнікі за выбарамі намякнулі, што заходняя рэакцыя выклікана галоўным чынам пра-расейскай пазыцыяй Лукашэнкі.

У той час, калі ЗША афіцыйна заявілі, што ня супраць расейска-беларускага саюзу, у прыватных размовах заходнія дыпляматы ў Менску адгукаюцца аб гэтых плянах у вышэйшай ступені крытычна.

**Паводле «The TIMES».**

vytoki.net

# ЭЎРОПА НЕ ПРЫЗНАЛА «ВЫБАРАЎ» У ПАЛАТУ

***Краіны Эўропы не прызналі "выбараў" у палату, якія праводзіў 15 кастрычніка Лукашэнка. Ужо на наступны дзень пасьля галасаваньня Місія па тэхнічнай ацэнцы АБСЭ заявіла, што выбары ў Беларусі "не адпавядалі міжнародным стандартам".***

Вось што сказана ў папярэднім заключэньні Місіі Арганізацыі па бясьпецы й супрацоўніцтву ў Эўропе:

16 кастрыніка 2000 г. Місія тэхнічнай ацэнкі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДіПЧ) прадставіла свае папярэднія высновы наконт выбараў 15 кастрычніка ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасьці з рашэньнем трэцяй Тэхнічнай канфэрэнцыі, якая адбылася 30 жніўня ў Вене, БДіПЧ прыняло рашэньне скіраваць на выбары ў Беларусь толькі Місію тэхнічнай ацэнкі. У сувязі з тым, што палажэньні пра папярэдняе галасаваньне, пераносныя скрыні для галасаваньня, правілы падліку і абагульненьня вынікаў галасаваньня далёка не адпавядалі мінімальным патрабаваньням адкрытасьці, неабходным для ажыцьцяўленьня незалежнай праверкі, БДіПЧ (АБСЭ) адмовілася скіраваць сваіх назіральнікаў у дзень выбараў.

Іншымі прычынамі, якія тлумачаць неадпаведнасьць гэтых выбараў мінімальным міжнародным патрабаваньням, зьяўляюцца:

Заканадаўства аб выбарах, прынятае напачатку 2000 г. З наступнымі зьменамі і дадаткамі, унесенымі ў чэрвені, будучы палепшаным, усё роўна ўтрымлівае істотныя і значныя недахопы.

Тым ня менш, усебаковае выкарыстаньне выбарчага заканадаўства магло б забясьпечыць дэмакратычнасьць працэсу выбараў, але гэтаму перашкодзілі наступныя фактары:

1.Ажыцьцяўленьне выканаўчай уладай кантролю за работай выбарчых камісіяў.



*Прадстаўнікі Парлямэнцкай тройкі АБСЭ правялі раніцай 16 кастрычніка прэс-канфэрэнцыю наконт палітычнай сытуацыі ў Беларусі пасьля праведзеных выбараў*

2. Злоўжываньне працэдурай рэгістрацыі кандыдатаў дазволіла выключыць непажаданых прэтэндэнтаў зь перадвыбарнай барацьбы, што абмежавала свабоду выбару.

3. Ажыцьцяўленьне жорсткага рэгуляваньня перадвыбарнай кампаніі кандыдатаў, што абмежавала магчымасьць яе правядзеньня".

*Заява Дзяржэпартамэнту ЗША*

# БЕЛАРУСЬ: ВЫБАРЫ 15 КАСТРЫЧНІКА НЕ БЫЛІ ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ

Злучаныя Штаты салідарныя са сваімі эўрапейскімі калегамі ў непрызнаньні выбараў, якія прайшлі 15 кастрычніка ў Беларусі, свабоднымі, справядлівымі і празрыстымі. Тэхнічная місія БДІПЧ АБСЭ, а таксама Эўрапейская Парлямэнцкая Тройка прыйшлі да высновы, што выбары не адпавядаюць міжнародным дэмакратычным патрабаваньням. Злучаныя Штаты заяўляюць аб непрызнаньні вынікаў выбараў, і працягваюць лічыць адзіным легітымным парлямэнтам Вярхоўны Савет 13-га скліканьня, пад началам Сямёна Шарэцкага. Свабодныя, справядлівыя і празрыстыя выбары характарызуюцца ня толькі свабодным доступам грамадзянаў да выбарчых скрыняў у дзень галасаваньня. Гэтая ўмова зьяўляецца толькі неад'емнай рысай такіх выбараў, якія таксама маюць на ўвазе кампанію па свабодным абмене думкамі паміж бакамі, якія балятуюцца на выбарах. Нягледзячы на тое, што і ЗША і ЭЗ і АБСЭ неаднаразова патрабавалі стварыць неабходную атмасфэру вакол выбараў, беларускімі ўладамі не было дасягнута ніякага прагрэсу ў гэтым кірунку.

Непасрэдна ў дзень галасаваньня зьявілася інфармацыя аб фальсыфікацыі вынікаў з боку рэжыму. У парушэньні беларускага выбарчага кодэксу, скрыні для галасаваньня дастаўляліся па месцы жыхарства электарата, якога да таго ж пераконвалі прагаласаваць. Тое, што ўладам прыйшлося пайсьці на такія выключныя меры, сьведчыць пра эфэктыўнасьць кампаніі байкоту выбараў, разгорнутай апазыцыяй.

Злучаныя Штаты глыбока шкадуюць аб тым, што беларускія ўлады праігнаравалі жаданьне ўсё большай колькасьці сваіх грамадзянаў вярнуцца да дэмакратыі, і асуджаюць сур'ёзныя парушэньні, дапушчаныя рэжымам Лукашэнкі падчас выбараў. Прэзыдэнцкія выбары, запланаваныя на наступны год, павінныя быць пазбаўленыя такога кшталту парушэньняў, у адваротным выпадку яны таксама будуць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю нелегітымнымі.

**Філіп РЫКЕР, намесьнік прэсавага сакратара**


vytoki.net

# З праграмы БНФ "Адраджэньне"

БНФ "Адраджэньне" – гэта шырокі грамадзкі рух грамадзянаў, якія выступаюць за дэмакратычныя ідэалы, за моцную незалежную дзяржаву Беларусь, за сацыяльную рынкавую эканоміку, за нацыянальна-культурнае адраджэньне нашага народу. БНФ гуртуе людзей рознага сацыяльнага стану, прафэсійнай, нацыянальнай, рэлігійнай прыналежнасьці. БНФ яднае і беспартыйных, і сяброў дэмакратычных партыяў. Удзел у БНФ несумяшчальны з прапагандаю таталітарнае ідэалёгіі, клясавае, нацыянальнае, расавае, рэлігійнае нецярпімасьці. БНФ – гэта рух, які імкнецца адлюстроўваць і бараніць інтарэсы ўсяго беларускага народу, ствараць магчымасьці для народнага палітычнага волевыяўленьня.

Галоўная мэта БНФ "Адраджэньне" – вольны чалавек у адроджанай незалежнай Беларусі.

Маральны аўтарытэт у людзей БНФ набыў за гады ахвярнай і бескарысьлівай працы яго сяброў і прыхільнікаў дзеля адраджэньня Бацькаўшчыны. БНФ вымагае ад палітыкі і палітыкаў сумленнасьці, непадкупнасьці, маральнае чысьціні.

**БНФ** – ня "левы" і ня "правы". **БНФ – НАРОДНЫ РУХ ПАЛІТЫЧНАГА ЦЭНТРУ.**

**БНФ у сваёй дзейнасьці імкнецца быць у згодзе з маральнымі прынцыпамі справядлівасьці, салідарнасьці й дабра.**

# БНФ "Адраджэньне" – шлях у Эўропу

У выніку дзяржаўнага перавароту ў 1996 годзе з дапамогай Масквы на Беларусі ўсталяваўся дыктатарскі рэжым. Законны парлямэнт быў разагнаны, распачаліся рэпрэсіі, эканамічны заняпад, была ўведзеная цэнзура. Колькасьць насельніцтва да 2000 году зьменшылася да 10 мільёнаў.

Увесну 2000 году масавыя выступы народу супраць дыктатуры і заняпаду прыцягнулі да Беларусі ўвагу ўсяго сьвету.

Сёньня БНФ "Адраджэньне" супрацьдзейнічае разбурэньню нашай краіны, уцягваньню яе ў Расейскую імпэрыю. Супрацьстаяць хлусьне й дэмаралізацыі нашага грамадзтва праз манапалізаваныя рэжымам сродкі масавай інфармацыі.

БНФ "Адраджэньне" зарэгістраваны як грамадзкае аб'яднаньне і як палітычная Партыя БНФ. У 1999 годзе на 6-м зьезьдзе кіраўніком БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ быў абраны Вінцук Вячорка.

БНФ плянуе прыйсьці да ўлады праз свабодныя і справядлівыя выбары і адвяргае чарговы падман народу ў выглядзе выбарчага фарсу.



# Праграма рэформаў БНФ "Адраджэньне"

– Спрашчэньне і зьмяншэньне падаткаў;
– Стабілізацыя нацыянальнай валюты і яе свабодны абмен;
– Прыватызацыя на конкурсах (аўкцыёнах) урадавай (дзяржаўнай) маёмасьці;
– Увядзеньне прыватнай уласнасьці на зямлю для грамадзянаў Беларусі;
– Увядзеньне мінімальных заробкаў і пэнсіяў на роўні пражытачнага мінімуму (30000 рублёў у месяц на чэрвень 2000 г.);
– Вяртаньне прынцыпу падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую й судовую;
– Усталяваньне свабоды сродкаў масавай інфармацыі;
– Накіраваньне бюджэтных сродкаў на адукацыю і ахову здароўя;
– Стварэньне дэмакратычнай сыстэмы мясцовага самакіраваньня замест вэртыкалі;
– Усталяваньне добрых адносінаў з суседнімі краінамі, з усім сьветам;
– Іншыя пераўтварэньні скіраваныя на паляпшэньне дабрабыту й адраджэньня народу.

vytoki.net

БНФ паўстаў у 1988 годзе. Упершыню за шмат гадоў апазыцыйны дэмакратычны і незалежніцкі рух у Беларусі аформіўся арганізацыйна. Упершыню ў падсавецкай Беларусі зьявілася палітычная сіла, якая пераняла традыцыю нацыянальна-вызвольнай і дэмакратычнай барацьбы слаўных папярэднікаў - паўстанцаў супраць Расейскай імпэрыі, адраджэнцаў пачатку нашага стагодзьдзя, стваральнікаў і абаронцаў БНР. БНФ стаў галоўнаю сілаю, якая процістаяла і процістаіць таталітарнай сыстэме. БНФ пераадолеў палітычную манаполію камуністаў у Беларусі, вынес галоўны цяжар барацьбы з рэжымам і савецкай імпэрыяй. БНФ "Адраджэньне" паспрыяў далучэньню мільёнаў суайчыньнікаў да палітычнага жыцьця і да нацыянальна-культурнага адраджэньня. БНФ першы сказаў народу праўду пра злачынную сутнасьць і беспэрспэктыўнасьць камуністычнага рэжыму, пра заняволенасьць беларускага народу ў імпэрыі і · п р а неабходнасьць адваяваньня незалежнасьці, пра змрочныя наступствы Чарнобыля.

БНФ супрацьстаіць · бяспраўю, дыктатуры, галечы і актыўна дзейнічае на карысьць вольнай і незалежнай краіны, дзеля свабоды й дастатку для кожнага чалавека.

**БНФ разам з усімі дэмакратычнымі сіламі Беларусі валодае дастатковым разумовым патэнцыялам і палітычным вопытам, каб узяць на сябе адказнасьць за лёс Бацькаўшчыны. Ён здольны аб'яднаць намаганьні навукоўцаў, палітыкаў у распрацоўцы шляхоў і ажыцьцяўленьні выхаду Беларусі з крызысу. Ён запрашае да супрацоўніцтва ўсіх, хто бачыць, што альтэрнатывы незалежнай і дэмакратычнай Беларусі няма.**

# Кіраўніцтва БНФ



**Вінцук ВЯЧОРКА – старшыня**



**Юры ХАДЫКА – намесьнік старшыні**



**Алесь БЯЛЯЦКІ – намесьнік старшыні**



**Вячаслаў СІЎЧЫК – намесьнік старшыні**



**Анатоль ФЁДАРАЎ – намесьнік старшыні**



**Віктар ІВАШКЕВІЧ – намесьнік старшыні**



**Павал СЕВЯРЫНЕЦ – намесьнік старшыні**

***Кантакты:***

Менск тэл: (017)2845012 ф.(017)2133008
Гарадзенская вобл. тэл: (0152)784074
Берасьцейская вобл. тэл: (0162)410029
Гомельская вобл. тэл: (02342)27537
Магілёўская вобл. тэл: (0222)225419
Віцебская вобл. тэл:(0214)520639

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

______________________________
(прозьвішча)

______________________________
(імя)

______________________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» ____________________ 19___ г**

**жыве па адрасе:** ______________________
(індэкс і поўны адрас)

______________________________

**род заняткаў:** ______________________

**тэл.** ______________________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

__________ (дата) __________ (подпіс)

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12 sprava H15

НавіНЫ
БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
СПЭЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК, кастрычнік 2000 г, наклад 299 асобнікаў

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net